Год I. Субота 24 сьнежня 1921 г. № 3.

РАНІЦА

штодзенная, грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЕС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ	Цана нумару 20 марак.	ЦАНА АБВЕСТАК:
Вільня, Вострабрамская № 4, „Hotel Szlachecki“ пак. № 2. Рэдакцыя адчынена што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1 і ад 5 да 7 гадз.	Падпіска на 1 мес. . . 400 марак, З перасылкай 1 „ . . 500 „ За граніцай ў два разы даражэй.	За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м. ў тэксьце . . . . . . 75 м. за тэкстам . . . . . . 40 м. Для шукаючых працы на 10 прац. таней.

Беларусы! Усе на выбары, як адзін! Усе на абарону Бацькаўшчыны!

Беларускі Народзе!

Шмат гадоў цягнецца твая цяжкая нядоля'

Многа зьдзеку, уціску, гора і пакуты перанёс ты, Беларускі Народзе!

Вайна і Маскоўцы зьнішчылі тваю гаспадарку; аднялі ад цябе лепшых сыноў, надругаліся над тваёй Верай, голага і босага, ледзьве жывога, прывязьлі цябе ў родную зямельку, у родную хату, на мейсца твае старое сялібы, гдзе ты знайшоў замест поля — воўчыя ямiны, акопы і калючы дрот,..

І вось цяпер, калі частка тваей зямліцы, дзякуючы братом—палякам, асвабадзілася з пад гнёту Маскоўцаў, настаў час адбудовы твайго жыцьця, у гэты адпаведны і гістарычны момант твае сялянскія прадстаўнікі, сабраўшыся 11—12 сьнежня ў г. Вільні на з'езд усе, як адзін чалавек, згадзіліся і 1) Моцна і шчыра стаяць на грунце аб'яднаньня ўсіх беларусаў з народм польскім, прызнаньня дзяржаўнасьці польскай па прычыне аўтаномнай злучнаесьці, 2) Прыняць учасьце і распаўсюджываць сярод усяго беларускага народу ў выбарах да Сойму Сярэдняе Літвы і Варшаўскага Рэчыпаспалітай Польскай, 3) Дамагацца ўсімі сіламі да злучэньня адарванай часьці Беларусі адданай па Рыскаму трактату Маскоўскім камуністам. 5) Кляймiць усім цёмных асоб, якія сеюць разлад сярод беларускага народу, прыкрываючыся яго іменем і праводзячы камуністычную агітацыю, а так сама асобаў, выступаючых ад імя ўраду Ластоўскага, знаходзячагася ў Коўне і абсалютна нічога ня маючага супольнага з беларускім народам.

Дык вось, Беларускі Народзе! Клічам з шчырым сэрцам споўніць гэтыя пастановы, якія дадуць табе многапакутны народзе, правы на лепшае жыцьцё, на абарону ад маскоўскіх наездчыкаў, ад усялякіх безадказных людзей, якія прыкрываючыся беларускім імем, прыхоўзяць да цябе з пекнымі лёзунгамі, дакляруюць зямлю, волю, хлеб, шчасьце, даюць усялякія прыемныя абяцанкі, ашуківаюць і самі, набіўшы кішэні нямецкімі маркамі, уцякаюць за граніцу ў Бэрлін, у Коўну, адкуль зноў прысылаюць да цябе сваіх агентаў, каб баламуціць і зьбіць з пэўнага шляху тваіх сыноў.

Ня вер, Беларускі Народзе, самазваным урадам, іх прыхільнікам і агентам!

Ня вер усялякім ашуканцам, якія будуць намаўляць цябе не падаваць свайго голасу ў Віленскі Сойм.

Наадварот, галасуй, як адзін галасуй за пэўных людзей, якія будуць стаяць за твае правы, за родную зямельку!

Галасуй дзеля таго, каб увесь сьвет чуў, чаго хоча беларускі народ, з кім ён ідзе і на каго спадзяецца!

Галасуй! Ня вер сваім ворагам, хаця яны і закрываюцца нацыянальным імем беларуса, але за каркам іх стаяць твае ворагі— бальшавікі, маскоўцы і немцы і іх прыхільнікі.

Ідзі — нясі свой голас у выбаровыя ўрны. Хай у Віленскім Сойме твае прадстаўнікі бароняць беларускую справу і Беларускі Народ!

Галасуй Беларускі Народзе за свае беларускія спіскі, і ты знайдзеш лепшае жыцьцё, знайдзеш свае правы на лепшую долю!

Цэнтральны Беларускі Выбарны Камітэт.

Хто за лепшую будучыну Беларусі. Хто за лепшую долю селянскага люду-галасуйце у Віленскі Сойм!

Вільня 24 сьнежня.

Каму ня ведама, што бальшавікіне шкадуюць грошаў, дзеля заграмічнай агітацыі. Цэлыя сотні, а мо і тысячы бальшавіцкіх агентаў вядуць самую тонкую, ледзьве прыкметную агітацыю—у вагонах, у рэстаранах, цукернях—гдзе толькі зьбіраюцца людзі — ускды тырчаць па гадзінам бальшавіцкія шпегі, заводзяць асьцярожную гутарку, пачынаюць хваліць парадкі ў Савецкай Беларусі, кажуць, што там і школы беларускія істнуюць і таргоўля свабодная, і дастаць усё можна... Адным словам жыцьцё там такое, якога у нас ніколі ня было і ня будзе..

Гэтак пяюць бальшавіцкія агенты, і ўлаўляюць душы людзей... Але тыя беларусы, якія добра ведаюць бальшавіцкі „рай“ у Савецкай Беларусі, нашы партызаны і ўцекачы з Меншчыны і Случчыны сьведчаць аб тым, што робіцца з нашымі братамі, якія зьдзекі і гвалты, якія мучэньня перажываюць яны ў склепах чразвычаек, у вастрогах... Як нішчыцца усё потам і кроўю здабытае, як чакаюць людзі збаўленьня, чакаюць што хтось прыйдзе і выратуе ўсіх з цяжкай няволі, прыйдзе і здыме з іх бальшавіцкія кайданы...

Аб усім гэтым сьведчыў і на на зьездзе прадстаўнікоў Заходняй Беларусі толькі што прыехаўшы з Савецкага „раю“ чалавек.

І вось цяпер, калі хто кажа, што ў нас кепскае жыцьцё, бо зачынілі нейкую беларускую школу, ці пасадзілі кагось у вастрог, ці выбары ў Сойм ні бы то „не свабодныя“, калі хто кажа, што ня трэба беларусам ісьці на выбары у Віленскі Сойм, ня трэба выявіць волю народа, і сьведчыць прад усім сьветам аб сваіх жалях і патрэбах — дык ужо лёгка прызнаць, хто стаіць за каркам прамоўцы, хто падшэптывае гэтыя выразы...

✦✦✦✦

ТЭЛЕГРАМЫ.

З Варшавы.

ВАРШАВА 23.XII (А. В.) На ўчарашнім пасяджэньню Рады Міністраў ў Бэльвэдэру, пад правадырствам Начальніка Панства была між іншым гутарка аб выбарах па Віленшчыне;

Другі раз Рада Міністраў зьбярэцца 2 студня.

— 23.XII (А. В.) Міністр заграничных спраў выязджая на сьвята ў вотпуск на некалькі дзён.

— 23.XII (А. В. Польска-Гданская Камісія прышла да згоды па ўсіх пунктах у справе польска-гданскага укладу. Сягодня маюць акончыць перагаворы.

— 23.XII (А. В.) Старшыня французкай місіі гэн. Дзюпонт у канцы сьнежня ад'езде з Варшавы.

— 23.XII (А. В.) Бальшавіцкі пасол Карахан перад сваім выездам ў Маскву, зрабіў візыт міністру Скірмунту.

— 23.XII (А. В.) Учора было пасяджэньне между міністэрскага камітэту, пад правадырствам Філіповіча. Гаманілі аб рэалізацыі рыжскага трактату.

З Пазнані.

ПАЗНАНЬ 23.XII (А. В.) 27 сьнежня да Пазнані прыедзе Начальнік Панства, з мэтай ўзяць удзел у сьветкаваньні гадаўшчыны Велька-Польскага паўстаньня.

З Саўдэціі.

ХАРКАЎ 23.XII (А. В) Ад 17 сьнежня ў Харкаве цягнуцца перагаворы з прадстаўніком Літвы аб дадатковай украінска літоўскай умове.

ВАШЫНГТОН. 23.XII (А. В.) У Вашынгтон вярнуўся сябра місіі Гоовера п. Гоодрiх, які быў дэлегаваны ў Маскоўшчыну. Гоодрiх падаў Гардунгу рапарт, гдзе ён кажа, што Маскоўшчына хутка зьбліжаецца да капіталістычнага устрою. Гоодрiх зноў вернецца ў Маскоўшчыну, каб сабраць Амэрыцы патрэбныя ёй інфармацыі.

✦✦✦✦

Навакола выбароў у Сойм.

На паўночнай частцы Сьвянцянскага павету, літоўцы-жыхары рыхтуюцца да выбараў ў Сойм.

✦✦✦✦

КАРЭСПАДЭНЦЫЯ.

З Дзісненскага павету

(ад нашага карэспандэнта).

Працуючы па адкрыцці школ ў Дзісненскім павеце мне здарылася прыняць шмат труднасьцяў. Перш-наперш прыйшлося адчыніць школы на беларускай

Хто ня хоча кайданоў Маскоўшчыны галасуй за-Беларускі спісак у Сойм!

мове, якія істнавалі ў прошлым годзе і ў якіх засталіся беларускія падручнікі. Калі прыехалі на вёскі польскія вучыцялі, каб распачаць навуку, то адбыўся ў гэтай справе сход, на якім бацькі згадзіліся, а так сама прасілі каб апроч польскай мовы выкладаць дзецям беларускую ці рускую. Бо зразу толькі на польскай мове іх дзецям вучыцца цяжка, а галоўнае тое, што адбіраць сваю родную мову і асьвету—цяжка сэрцу. Бачыўшы такое жаданьне сялян ня можна было стрымацца і пачалася самая энэргічная праца каб не заставіць жаданьне бацькоў і іх дзяцей без ніякага рэзультату.

Пасьля таго як я быў выбраны ад сялянства клапаціцца адчыніць школу, то па сходзе гаварылі куды трэба зьвярнуцца і што рабіць, каб урад дазволіў пачаць навуку, паачародна з польскім вучыцелем ці уставіць дзеля гэтага; вечаровую зьмену.

Дзеля гэтай справы без ўсялякіх затрыманьняў, паехаў да п. інспэктара пачатковых школ прасіць яго дазволіць адчыніць такую і памагчы ў гэтай справе, бо пара ідзе, і дзеці хочуць іська ў школу і вучыцца. Падаўшы паданьне ад сялян каб разрашылі вучыць пабеларуску, была атрымана такая рэзалюцыя, што можна вучыць некалькі гадзін у тыдзень. Сяляне пачуўшы такую адмову ня былі здаволены гэтым, і рашылі ізноў паслаць да інспэктара і прасіць дазволіць вучыцца іх дзецям колькі яны хочуць. Так прыйшлося езьдзіць пакуль не атрымаў нарэшце тое, што можна выкладаць прыватна навуку на якой хочуць мове. Цяпер шмат гдзе ідзець навука ў павеце і дзеці вучацца на беларускай і польскай мовах.

Працаўнік.

◆◆◆◆

Хроніка.

Начальнік Панства выбаршчык.

◆ Начальнік Панства Язэп Пільсудскі, як грамадзянін Віленшчыны, зьвярнуўся ў выбарнае бюро і быў запісаны ў спісак пад № 1250. Свой голас п. Пілсудскі будзе падаваць у унівэрсутэце. Цікава, за які спісак будзе галасаваць Правадыр Польшчы.

Асьвяшчэньне памяшчэньня Рэдакцыі.

21 Сьнежня ў рэдакцыю „Раніцы" былі запрошаны вядомыя беларускія дзеячы ксёндз Пятроўскі і сьвяшчэньнік айцец Міхаіл Кушнёў, Кс. Пятроўскі прачытаў малітву і асьвяціў памяшчэньне рэдакцыі і канторы. Потым сьвяшчэньнік айцец Міхаіл адслужыў малебен, прад началам каторага з'вярнуўся да прысутных з прамовай, у якой паміж іншым, указаў, што добрае дзела, якое закладаецца дзеля карысьці свайго народу заўсёды павінна даць добрыя плады.

Закончыў айцец Міхаіл пажаданьнем усяго найлепшага для Беларускай справы і пасьля акрапіў св. вадой памяшчэньне.

На малебене апроч рэдактара і супрацоўнікаў газэты „Раніца" былі прысутнымі: П. Аляксюк, рэдактар газэты „Jednaść" п. Шышкоў, п. Пупка, служачыя ц. к. „Краёвай Сувязі", супрацоўнікі газэт „Jednaść" і „Родная Страха", прадстаўнікі ад зялёнадубцаў і залезнадарожнікаў.

Навіны ў тры радкі.

◆ Чычэрын выдаў новую ноту да фінляндскага ураду.

У гэтай ноце ён пагражае Фінляндыі.

◆ Савецкая Расея закупіла ў немцаў 300.000 карабінаў. Частка іх знаходзіцца ужо ў Швэцыі і хутка будзе адпраўлена ў Расею.

◆ На варшаўскай гельдзе закардонная валюта значна зьніжаецца. Даляр, напрыклад, 21 сьнежня каштаваў 2.880 п. мар.

◆ Сэкрэтарыят Лігі Народаў паведаміў міністэрства спраў заграпічных, што чэшскі ўрад дакляраваў даць мільён чэшскіх каронаў на барацьбу з эпідэміямі ў Польшчы.

◆ Паміж Нямеччынай і Югаславіяй зроблена тарговая умова.

Украінска-нямецкія гандлёвыя перамовы зьбліжаюцца да канца.

◆ У Варшаве міністэрства працы дазволіла перад Калядмі трымаць крамы адчыненымі да 9 гадзін вечара.

◆◆◆◆

Толькі адна ночка.

(абразок)

Цягнецца лес сьцяною па бакох шляху, а ў небе высокім зоркі гараць... Сьнег роўна ляжыць высокі пульхны, так хочацца кінуцца ў яго і патапіцца ў ім, але, не, барані Божа, мне трэба сьпяшацца і я шпарка іду шляхам далей... Сэрца моцна калоціца ў грудзёх, я саўсім замарыўся, іські цяжка далей...

Божа, Божа, што будзе? я спазьнюся..

Жаль сьціснуў грудзі, сэрца перастала біцца, і вочы заліў чырвоны агонь...

Паміраю! мігнула душа, і я прачнуўся...

Гдзе я? Што гэта. Сон! Гдзе я?...

Галава круціца, цяжка ў грудзёх, няма чым дыхаць...

Што гэта? Страх апанаваў мяне...

Вось чую, як-бы хто за сьпіной маей сьмяецца...

Ха, ха, ха, ха, ня ўжо не пазнаеш? Гэта ж труна, і ты ў ей ха, ха, ха... Труна, труна, і я ў ей! шэпчуць мае губы.

Божа правы! няўжо гэта праўда? Дык я ужо нябошчык?

Холад прайшоў па ўсіх жылах..

Не, не, ня можа быць! Гэта я саўсім яшчэ ня прыйшоў да сябе мігаюць думкі адна за аднэй...

Але што так крывавым сьветам грызе вочы? а вось яна! гэта лямпа, з якой чорнымі клубамі вылетае копаць...

Цяпер я добра разглядзеў. Збоку мяне ляжыць рад людзей і напроць так сама. Яны захаваліся пад свае вопраткі і толькі ногі тырчаць чырвоныя, чырвоныя...

Дык вось яно, гдзе я!

Каб хутчэй бы гэта ночка прайшла...

Ціха капае вада, вада гудзіць...

Ха, ха, ха... у вушох гдзе аддаецца. Гэта —труна, і ты ў ей. . . . . .

Я разглядаю і далей і горка мне робіцца за людзей . . . . .

Божа, пашлі мне сьмерць! я пачынаю маліцца...

Другая падымай.

Як гром раздаецца аднекуль. Зьвякнулі кайданы . . ! .

Уваскрэслі нябошчыкі . . . .

Малітва мая кудысь ад мяне уляцела . . . .

Ня мог я маліцца далей!

Бо прачнуўся дзьявал і над нашай труной панаваў . . . . . .

Дзяргач.

◆◆◆◆

Беларускае жыцьце.

ВЫБАРНЫ КАМІТЭТ.

Пры Цэнтральным Камітэце Краёвай Сувязі, пад кіраўніцтвам беларускага дзеяча п. Курыловіча арганізованы Цэнтральны Выбарны Камітэт (Вільня Афярная 4—2) і ўжо адкрыты акруговыя Выбарныя Камітэты ў Ашмяне і Кемаях.

ШКОЛЬНАЯ СПРАВА.

Калі будзе з'арганізованы пэдагогічны пэрсанал — у Радашкавічах будзе адчынена беларуская ўрадовая гімназыя.

— За апошні месяц Асьветным аддзелам пры Цэнтральным Камітэце Краёвай Сувязі адчынена 50 прыватных беларускіх школ у Стаўпецкім, Слонімскім, Вілейскім, Лідзкім і Валожынскім паветах.

Асьветным Аддзелам пры Цэнтральным Камітэце Краёвай Сувязі высылаецца на правінцыю школьныя інструктары ў справе адкрыцьця беларускіх урадовых школ згодна жаданьня жыхароў на мяйсцох.

◆◆◆◆

Маленькі фэльетон.

Біскупя 12.

Колькі тыдняў таму назад зайшоў я ў быўшы Беларускі Клюб, гдзе зара месьціцца музыкальна-драматычны гурток.

Гэта было ў вечары. Гулялі спэктакль. Не памятаю добра, што гралі. Пасьля пачаліся скокі.

Божухна мой! „Што рабілася".

Дэмакратыя добрая рэч, але усё ў меру. Адзін жаўнер тут жа скакаў з пакаёўкай ад буфэту, якая, наваг, не паклапацілася зьняць фартух.

У салі курылі, ня гледзячы на тое, што ўсюды былі надпісы, просячыя гэтаго не рабіць, на трох мовах — беларускай, польскай і літоўскай.

Адзін ажно скакаў з папяросай ў зубах. Пекны быў відак.

Я зьвярнуў ўвагу на гэта аднаму з сяброў гуртка.

Ні якіх дзяжурных старшынь ня было, і ён нічога зрабіць ня мог.

Прайшло колькі дзён і вось пасьля з'езду дэлегатаў Заходняй Беларусі, я ў дзень ўздумаў пайсьці ў так званы Беларускі Клюб паабедаць.

Каля самай дзьверы мяне спаткаў пан В., запытаўся, да каго я іду. Даведаўшыся, што іду да буфэту, пан В. мне адказаў:

„Калі ласка зьвярнецеся ўпярод да дзяжурнага старшыні, зара ўжо ня можна абы каму ўходзіць".

Разумеецца да дзяжурнага старшыні я не пайшоў, а пайшоў да рэстарацыі і там зьеў абед...

Дзіўна мне які можа быць дзяжурны старшыня, калі клюба няма, а ёсьць гурток...

Пэўна яны тагды былі не патрэбны...

У цікавы спосаб пан. В. і К-о пачаў змагацца са сваімі палітычнымі ворагамі. Па другой прычыны рабіць перашкоды для ўвахода ў „клюб" нам партызанам, праліваўшым кроў за Бацькаўшчыну, я ня ведаю.

Бываюць-жа там і зара шмат саўсім ня беларусаў—з якіх я колькіх ведаю і па прозвішчу. Тым болей, здаецца, меў-бы права бываць там без перашкоды беларускі партызан. Але пан В. думае інашэй...

Няхай-жа думае.

Ня вельмі аб тым шкадуемо!

Можа другі раз папросіць, але будзе позна...

Відаць нам з вамі, не падарозе ня толькі ў палітычным жыцьці, але і ў звычайным..: Бывайце!

Паляшук.

Стэнаграма З'езду Заходняй Беларусі.

Абрамовіч (прадстаўнік ад студэнтаў,): Сяляне! я хачу сказаць пару слоў ад імя беларускіх студэнтаў—Вашых сыноў, каторые з вялікім трудом папалі ў высшае вучэбнае завяденьне. Мы тутака сабраліся сягоньня і маем магчымасьць свабодна гаварыць аб сваіх справах і адносінах да польскага народу, Вялікшая частка нашай Беларусі знаходзіцца яшчэ пад маскоўскай нагайкай і мы павінны памятаваць аб сваім становішч. Між вамі няма многіх лепшых сыноў, каторыя мелі бы права тут судзіць і падаць свой голас аб тэй справе, аб якой тутака гаворыцца. Я хачу сказаць, што мы ня йдзём тым шляхам, па якім павінны іські, я хачу напомніць, што вы пачынаеце іські крывой дарогай...

Старшыня: (звоніць і просіць студэнта ня вучыць з'езд) Прашу Вас трымацца той тэмы, дзеля якой ўзялі слова.

Студэнт прабуе гаварыць далей, але дзеля таго, што яго прамова была не на тэму прывітаньняў—старшыня, перасьцярогшы яго колькі разоў—пазбавіў слова.

Вайткевіч: Ад імя беларускіх артыстаў вітаю вас. Мы артысты дапаможам вам у вашай вялікай працы над адбудовай роднай Бацькаўшчыны—Беларусі. Няхай сцэна і мастацтва прыгожымі краскамі ўбярэ наш агульны шлях! Хай жыве Беларусь! Хай жывуць яе лепшыя сыны!

Рудзь прадстаўнік ад вучыцялёў: Вітаю З'езд і выказываю пажаданьні вучыцельства, каб праца З'езду здабыла як найбагацейшыя рэзультаты, як у справе школьнай так і наагул ва ўсей Беларускай справе.

Нялепка прадстаўнік беларускай прэсы: Ад імені супрацоўнікаў беларускай прэсы даручыўшых мне вітаю з'езд і выказываю пажаданьні, каб усе тыя пастановы, якія вы, сыны беларускага народу, кіруючыся, безумоўна, шчыраю любоўю да Бацькаўшчыны, тутака вынесяце—каб ўсе гэтыя пастановы, як найхутчэй увайшлі ў жыцьце.

Фёдараў (ад Горадзенскай моладзі) Грамадзяне, ад імя тых беларусаў, якія год таму назад былі ўгнецены ярмом маскоўскіх камуністаў, каторыя залілі нас крывёю, тэрорызавалі нашыя сямейства, нашую моладзь, нашы школы.— Вітаю з'езд і выказваю жаданьне, каб з'езд стаў на грунт супольнай працы з вызваліўшым нас польскім народам.

Калечыц (ад безпартыйнай канфэрэнцыі): Паны дэлегаты! Я хачу давесьці да Вашага ведама ў якім палажэньні знаходзяцца нашы лепшыя сыны ў Савецкай Беларусі, каторыя так многа зрабілі для нашай Бацькаўшчыны. Адных за тое, што служылі ў польскай арміі выслалі ў далёкую ўсходнюю пустынь на катаргу, другія томяцца ў чрэзвычайках і паміраюць з голаду. Тутака ёсьць дэлегат, маці каторага тыдзень таму назад памерла з голаду, бацька высланы ў Архангельскую губэрню, з яго хаткі зрабілі турму. Цяпер гэтых няшчасных, каторыя зрабілі ўсё, што маглі для Польшчы і для нас—заядае кароста, у іх няма кашуль, яны ня маюць мыла. Яны просяць помачы. Я веру, што ёсьць яшчэ людзі, якія з польскім народам выратуюць нашых братоў. Я прашу аб магчлівай дапамозе гэтым нашым братом і сыном.

Казлоўскі, (ад беларусаў у польскай арміі): сяляне! Вітаю Вас ад імя тых шчырых сыноў Бебарусі, каторыя пасьвяцілі ўсё свае жыцьцё войску і ўсімі сіламі дабіваліся волі Беларусі. Каб здабыць гэтую волю Беларусі трэба быць спэцыялістам вайсковым. Гэтыя людзі пайшлі ў армію, якая стаіць цяпер высака, нараўне з арміяй францускай; яны пайшлі ў польскую армію, каб навучыцца быць добрымі ваякамі беларускімі, яны пайшлі туды ня толькі дзеля таго, каб вучыцца фізычна, але і маральна і мы давялі, што беларусы таксама ўмеюць паміраць за свабодную Беларусь, як і польскі жаўнер за сваю Бацькаўшчыну.

Старшыня: Дазвольце мне ад імя Зьезду прывітаць лепшую нашу вайсковую моладзь, заданьнем якой зьяўляецца стварэньне сьветлага будучага Беларусі.

(Далей будзе).

Ня слухайце ворагаў беларускага народу-агітатараў проці выбараў.

Рэдактар і Выдавец Вацлаў Адамовіч. Друкарня „ДРУК", Субач, 2.

